Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывістаў судзяць за партрэты зьніклых на плошчы Перамогі

06.06.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед
Крыніца: Радыё «Свабода»



Судовая зала.

У Партызанскім судзе Менску 6 чэрвеня пачаўся разгляд адміністрацыйнай справы, пачатай супраць актывіста «Эўрапейскай Беларусі» Максіма Вінярскага і незалежнай рэжысэркі Вольгі Мікалайчык. Чарговае паседжаньне адбудзецца 13 чэрвеня.

Актывістаў вінавацяць у вывешваньні 16 сакавіка ля стэлы на плошчы Перамогі партрэтаў зьніклых апанэнтаў улады — Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і журналіста Зьмітра Завадзкага. Пад партэрамі памерам мэтар на два з паловай былі надпісы: «Дзе Захаранка?», «Дзе Завадзкі?», «Дзе Ганчар?», «Дзе Красоўскі?».

Вольга Мікалайчык сказала карэспандэнту Свабоды, што сёньня ў судзе паказалі відэа.

«Але цікава ня гэта. Высьветлілася, што цэлы месяц, з 16 сакавіка па 18 красавіка, супраць нас з Максімам была заведзеная крымінальная справа. Мы пра гэта ня ведалі і даведаліся толькі сёньня, што гэтая справа спыненая. Аказваецца, да мяне прыходзілі сьледчыя з Партызанскага РУУС, і мяне адзін раз не было дома, а другі раз я ім не адчыніла. Але ж нам усё ж павінны былі неяк паведаміць, што супраць нас была пачатая крымінальная справа. Але цяпер яна пераквалiфікаваная ў адміністрацыйную — за хуліганку. Цяпер нас ужо вінавацяць у правядзеньні несанкцыянаванага пікету.

Але я сёньня сказала ў судзе, што нават тыя людзі, якія ёсьць на відэа, ні ў чым не вінаватыя і яны нічога не парушылі. І я нічога не парушыла і ні ў чым не вінаватая і ня ведаю, чаму знаходжуся ў залі суду. А міліцыянты і судзьдзі будуць адказваць за парушэньне Канстытуцыі і Ўсеагульнай дэклярацыі

правоў чалавека, якая і мне, і тым людзям, якія былі на відэа, дазваляе і пікеты, і мірныя сходы, і акцыі, і свабоду майго сумленьня».

Разгляд справы сёньня адклалі, бо ў суд не зьявіліся сьведкі.

«Сьведкі — тыя, хто распачынаў справу. Амапаўцы прыехалі праз 50 хвілін пасьля таго, як зьявіліся партрэты на стэле. То бок людзей, якія павесілі партрэты, даўно ўжо там не было. І вось гэтыя амапаўцы будуць выступаць сьведкамі».


Справы Максіма Вінярскага і Вольгі Мікалайчык аб'яднаныя ў адну.

«Тое ж самае ў Максіма, мы выклікаемся па адной справе».


«Некалькі тыдняў таму вялікія партрэты зьніклых — Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага — былі разьмешчаныя актывістамі на мурах стэлы на плошчы Перамогі. Улады забралі жыцьцё людзей, а цяпер яшчэ і зьбіраюцца судзіць тых, хто супраць. Памятайма, каб не паўтарылася!», — напісаў у фэйсбуку **Павал Пракаповіч**.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА


РАЦЫЯ


kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка


ВЫТОКІ


memorial
Anti-Discrimination Centre


Московская Хельсинкская группа


AMNESTY INTERNATIONAL


МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ
У БЕЛАРУСІ


Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by


VOICE OF BELARUS


ENEMO


HUMAN
RIGHTS
HOUSE
NETWORK


fidh